Ольга МОШНОВА

# «Янішчыцкі лістапад»

**З 14 па 20 лістапада бібліятэкі Пінскага раёна праводзяць мерапрыемствы ў рамках Тыдня папулярызацыі творчасці нашай знакамітай зямлячкі, вядомай паэтэсы Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі імя Я.Купалы і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Яўгеніі Янішчыц «Янішчыцкі лістапад», паведамляе тэлеграм-канал «Культура Пинщины».**

Паэзія «палескай ластаўкі» адкрыла для нашай краіны і далёка за яе межамі цудоўны вобраз палескага чалавека, палескія краявіды, раку Ясельду, славутыя песні і паданні пра родны край. Для прыхільнікаў паэзіі правядуць літаратурныя вечарыны, гадзіны паэзіі, конкурсы чытачоў, выступленні літаратурна-паэтычных груп, агляды кніжных выстаў і мноства іншых цікавых мерапрыемстваў.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ**